других статьях СБ). В семантических структурах этих лексем заключены те основополагающие понятия, которые каузативно связаны с семами других положительно воспринимаемых квалитативно-аксиологических наименований особенностей белорусского народа: *памяркоўныя* – восходит к *меркаваць»,* то есть 1. Гаварыць, разважаць, абмяркоўваць. 2. Рабіць якія-н. вывады, дапушчэнні. 3. Мець намер, план. Лексема *разважлівы* – от *разважаць*, то есть 1. Мысліць, рабіць вывады. 2. Паслядоўна выкладаць свае думкі наконт чаго-н, весці гутарку [2].

Как показывает словарь, эти белорусизмы по смыслу очень близки, в большинстве контекстов взаимозаменяемы, что является одним из главных дифференциальных признаков слов-синонимов. И всё же при характеристике белорусов употребляются оба определения. Думаем, что это правомерное функционирование базируется на гиперсемантизации в семантической структуре первого слова сем *'рабіць якія-н. вывады'*, а во второй лексеме для избежания тавтологии различительной оказывается гиперсемантизированная сема *'паслядоўна'*. Все другие оттенки значений тоже реализуются и «работают», но они не различают лексемы, а, скорее, сближают их, объединяя для более выразительного и всеобъемлющего наименования высокооцениваемых качеств белорусского народа.

Таким образом, проникновение белорусских слов в тексты, написанные на русском языке, их употребление в разных коммуникативных регистрах – это закономерное и естественное явление, мотивированное спецификой белорусско-русского билингвизма, в котором главные позиции всё чаще занимает **автономное двуязычие**, то есть осознаваемое, грамотное, строгое, которое обеспечивает точность смысла высказывания. Употребление белорусизмов в русскоязычных статьях не только играет важную роль в структурировании языковой картины мира, но и усиливает ощущение связи с «родным кутам», земляками, Родиной.

Наш университет носит имя талантливого белорусского писателя Ивана Шамякина. В его произведениях “наша родная беларуская мова, прыгожая, багатая, блізкая да душы”. Хотим лучше её знать? Давайте почаще читать книги Шамякина. На белорусском языке.

**Список использованных источников**

1. Золотова, Г.А. Коммуникативная грамматика русского языка / Г.А. Золотова, Н.К. Онипенко, М.Ю. Сидорова. – М., 1998. – 528 с.

2. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / І.М. Бунчук, М.Н. Крыўко і інш. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : БелЭн, 1999. – 783 с.

## СКЛАДАНАСКАРОЧАНЫЯ НЕАЛАГІЗМЫ Ў МОВЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПУБЛІЦЫСТЫКІ

**А.В. Солахаў**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
спецыяліст УА МДПУ імя І. П. Шамякіна
(Мазыр, Рэспубліка Беларусь)
**Я.Я. Шпакевіч**
студэнт УА МДПУ імя І. П. Шамякіна
(Мазыр, Рэспубліка Беларусь)

Аналіз мовы сучасных беларускіх публіцыстычных тэкстаў паказвае, што адной з самых прадуктыўных сярод неалагізмаў з’яўляецца група складанаскарочаных слоў, г. зн. слоў, утвораных апакопай (не – назоўнік. Скарочаная структурная частка складанаскаро-



МГПУ им. И.П. Шамякина

чанага слова, што суадносіцца з першым кампанентам зыходнага словазлучэння, даследчыкамі называецца абрамарфемай – абрэвіятурнай марфемай [1].

Мэта артыкула – выявіць складанаскарочаныя неалагізмы ў мове беларускіх газет апошняга часу і апісаць іх словаўтваральныя тыпы.

Матэрыялам для даследавання паслужыла мова газет «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена» за 2023 – пачатак 2024 г.

Выяўленыя складанаскарочаныя словы-наватворы маюць у сваім складзе наступныя абрамарфемы:

1) *агра-* (< *аграрны*): *агравалакно* ‘валакно, прызначанае для аграрных мэт; спанбонд’: *Урадлівасць павялічваецца, а рост пустазелля, наадварот, прыгнятаецца. Падобнага эфекту можна дасягнуць і з дапамогай нятканага матэрыялу – спанбонду, або **агравалакна*** (Звязда. 2023. 13 крас. С. 16); *аградрон* ‘беспілотны лятальны апарат, прызначаны для выканання розных сельскагаспадарчых работ’: *Беларускія **аградроны** ўжо працуюць у сельскай гаспадарцы* (Звязда. 2023. 25 лют. С. 5);

2) *адмін-* (< *адміністрацыйны*): *адмінпрацэдура* ‘дзеянне, якое ажыццяўляецца дзяржаўным органам або іншай арганізацыяй па заяве грамадзяніна’: *З’явілася 20 **адмінпрацэдур** у галіне экалагічнай экспертызы…* (Звязда. 2023. 22 ліп. С. 5);

3) *анка-* (< *анкалагічны*): *анкацэнтр* ‘медыцынскі цэнтр, у якім вывучаюць праблемы анкалогіі і лечаць анкалагічнахворых’: *Усё планавае лячэнне анкалагічных пацыентаў ажыццяўляецца ў **анкацэнтрах**…* (Звязда. 2024. 14 лют. С. 13);

4) *бія-* (< *біялагічны*): *біягумус* ‘прадукт, які атрымліваецца ў выніку працэсу раскладання раслінных астаткаў, харчовых адыходаў і іншых арганічных рэчываў з выкарыстаннем дажджавых чарвякоў’: *…варта адразу набываць больш урадлівы грунт, у склад якога ўваходзіць **біягумус*** (Звязда. 2022. 19 студз. С. 16); *біяфунгіцыд* ‘натуральны сродак, створаны на аснове спецыяльных жывых арганізмаў, вірусаў або грыбкоў для барацьбы з грыбком і хваробамі раслін’: *Для абеззаражвання насення можна выкарыстоўваць **біяфунгіцыды** “Фітаспарын”, “Спорабактэрын”...* (Звязда. 2022. 19 студз. С. 16);

5) *вела-* (< *веласіпед*): *велапаркоўка* ‘збудаванне ў выглядзе адной або некалькіх стоек для захоўвання веласіпедаў’: *Унутраны двор закрыты – тут размесцяцца дзіцячыя пляцоўкі і **велапаркоўка*** (Звязда. 2023. 24 лют. С. 4);

6) *вент-* (< *вентыляцыйны*): *вентблок* ‘блок, прызначаны для выцяжной і прытокавай вентыляцыі ў жылых дамах і грамадскіх будынках’: *На камбінаце выпрабляецца практычна ўся прадукцыя, неабходная для будаўніцтва жылога дома: жалезабетонныя перагародкі, пліты перакрыцця, сценкі лоджый, **вентблокаў**, шахты ліфтаў…* (Звязда. 2022. 24 мая. С. 7);

7) *гастра-* (< *гастранамічны*): *гастратурызм* ‘від турызму, асноўнай мэтай якога з’яўляецца знаёмства з ежай і напіткамі таго або іншага рэгіёна, краіны’: *Апошнім часам асабліва актыўна развіваецца такі кірунак, як **гастратурызм*** (Звязда. 2024. 22 сак. С. 4); *гастрафэст* ‘серыя гастранамічных фестываляў, у час якіх установы харчавання прапаноўваюць сваю лепшую ежу і якасныя напіткі па фіксаванай цане’: *Традыцыйнымі сталі **гастрафэсты**, якія арганізуюць установы грамадскага харчавання* (Звязда. 2024. 9 сак. С. 4);

8) *дзярж-* (< *дзяржаўны*): *дзярждоўг* ‘вынік фінансавых запазычванняў дзяржавы з мэтай пакрыцця дэфіцыту бюджэту і выплаты доўгу па дзяржаўных гарантыях прыватным і дзяржаўным кампаніям’: *Выплаты працэнтаў па **дзяржоўгу** ФРГ выраслі з 2021 года ў 10 разоў, павялічыўшыся з 4 млрд да 40 млрд еўра* (Звязда. 2023. 1 сак. С. 2); *дзяржмаёмасць* ‘маёмасць, акрамя грашовых сродкаў, замацаваная за дзяржаўнымі юрыдычнымі асобамі, дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі на праве гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання, іншая маёмасць, якая прызнаецца дзяржаўнай



МГПУ им. И.П. Шамякина

на падставе міжнародных дагавораў’: *У камітэце **дзяржмаёмасці** згадалі яшчэ адзін цікавы аб’ект, які знаходзіцца ў вёсцы Поразава Свіслацкага раёна* (Звязда. 2023. 24 лют. С. 40); *дзяржструктура* ‘арганізацыя, установа, ведаства, якія кантралююцца дзяржавай’: *Пасля заканчэння ВНУ воін-інтэрнацыяналіст і ліквідатар наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС больш за 20 гадоў працаваў па набытай прафесіі ў розных **дзяржструктурах*** (Звязда. 2023. 15 лют. С. 4);

9) *інфа-* (< інфармацыйны): *інфавайна* ‘проціборства бакоў шляхам распаўсюджвання спецыяльна падрыхтаванай негатыўнай інфармацыі ў адносінах адзін да другога’: *А яшчэ той рост стымулюецца прыхаванымі трыгерамі, якія спрацоўваюць, нібы міны з расцяжкамі, калі трапляеш у іх сілавое поле. Адно слова, **інфавайна**...* (Настаўніцкая газета. 2024. 13 лют. С. 16);

10) *літ-* (< *літаратурны*): *літпалетак* (*жартоўнае*) ‘літаратурны палетак’: *Кветка з **літпалетка*** (Літаратура і мастацтва. 2023. 28 ліп. С. 16);

11) *мед-* (< *медыцынскі*): *медабслугоўванне* ‘аказанне спецыялістамі медыцынскай установы медыцынскіх паслуг пацыенту ў парадку, вызначаным заканадаўствам’: *Ад **медабслугоўвання** да рыбалкі* (Звязда. 2023. 1 сак. С. 9); *медпаслуга* ‘медыцынскае ўмяшанне з мэтай прафілактыкі, дыягностыкі або лячэння захворвання ў чалавека’: *Экспарт беларускіх **медпаслуг** для грамадзян Польшы за вясну-лета вырас больш як на 25 працэнтаў.* Звязда. 2023. 21 верас. С. 1; *медпрафілактыка* ‘комплекс медыцынскіх мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне высокага стану здароўя чалавека і папярэджанне ўзнікнення захворванняў і траўм’: *...Метад лячэння і **медпрафілактыкі** цяжкіх формаў бронхалёгачнай дысплазіі выкарыстоўваўся ў васьмі дзяцей...* (Звязда. 2024. 9 сак. С. 3); *медцэнтр* ‘установа, у якой выконваюць усе неабходныя медыцынскія паслугі, у т. л. дыягностыку, лячэнне, прафілактыку і абслугоўванне’: *Такую познюю выдачу даведкі **медцэнтр** матываваў тым, што ў дзіцяці жалезадэфіцытная анемія цяжкай ступені* (Звязда. 2023. 25 лют. С. 9); *меддаведка* ‘пісьмовае пацвярджэнне ўрача або іншага кваліфікаванага медыцынскага работніка аб выніках медыцынскага абследавання пацыента’: *Мама Ільі паказала мне арыгінал **меддаведкі**, з якой яна прыходзіла да дырэктара гімназіі* (Звязда. 2023. 25 лют. С. 9);

12) *нац-* (< *нацыянальны*): *нацаб’яднанне* ‘нацыянальнае аб’яднанне’: *Крыш’яніс Карыньш адзначыў, што “Аб’яднаны спіс” і **Нацаб’яднанне** робяць ўсё для таго, каб затармазіць спробы наладзіць больш дынамічную работу ва ўрадзе* (Звязда. 2023. 15 жн. С. 1); *нацвалюта* ‘законны плацёжны сродак, выпушчаны цэнтральным банкам краіны або грашова-кадытным упраўленнем’: *Большасць краін БРІКС падтрымалі ўзаемныя разлікі ў нацвалютах* (Звязда. 2024. 1 сак. С. 2);

13) *пед-* (< *педагагічны*): *педкаледж* ‘сярэдняя спецыяльная навучальная педагагічная ўстанова’: *Мэтавая падрыхтоўка ў **педкаледжах** запатрабавана не толькі аддзеламі адукацыі, але і абітурыентамі* (Настаўніцкая газета. 2024. 19 студз. С. 19);

14) *прам-* (< *прамысловы*): *прамвытворчасць* ‘вытворчасць прамысловай прадукцыі з выкарыстаннем машын, інструментаў і прыцягненнем працоўнай сілы’: *Беларусь стала лідарам па росце **прамвытворчасці** ў ЕАЭС* (Звязда. 2023. 15 жн. С. 1); *прамтурызм* ‘напрамак у турызме з арганізацыяй наведвання групамі турыстаў дзейнага або раней дзейнага прамысловага прадпрыемства’: *Лідарамі ў сферы **прамтурызму** па выніках 2023 года сталі холдынгі БелАЗ, МТЗ і МАЗ* (Звязда. 2024. 15 лют. С. 1);

15) *праф-* (< *прафесійны*): *прафстандарт* ‘характарыстыка кваліфікацыі, неабходнай для ажыццяўлення пэўнага віду прафесійнай дзейнасці, у т. л. выканання пэўнай працоўнай функцыі’: *Пасля зацвярджэння **прафстандартаў** прафесія можа быць унесена ў штатны расклад арганізацыі, а потым па гэтай прафесіі можна прымаць на працу* (Звязда. 2022. 27 мая. С. 4);

МГПУ им. И.П. Шамякина

16) *сац-* (< *сацыяльны*): *сацпаслугі* ‘дапамога грамадзяніну з мэтай паляпшэння ўмоў яго жыццядзейнасці або пашырэння яго магчымасцей’: *Адзіны інтэрнэт-партал* ***сацпаслуг*** *запрацаваў у Мінску* (Звязда. 2024. 12 сак. С. 1);

17) *сельгас-* (< *сельскагаспадарчы*): *сельгаскампанія* ‘сукупнасць мерапрыемстваў па максімальным забеспячэнні ўсім неабходным сельскагаспадарчых работ і выкананні іх у сціслыя тэрміны’: *Падчас* ***сельгаскампаніі*** *тут наймаюць дадаткова яшчэ 5–6 чалавек па дагаворах падраду* (Звязда. 2023. 25 лют. С. 6); *сельгасрынак* ‘сельскагаспадарчы рынак’: *А таму давайце пройдземся па найбуйнейшых сталічных* ***сельгасрынках*** (Звязда. 2023. 25 лют. С. 1);

18) *тур-* (< *турыстычны): турабсталяванне* ‘абсталяванне, прызначанае для турыстычных паездак’: *Адзін з важных кірункаў – прадстаўнікі вытворцаў* ***турабсталявання*** (Звязда. 2023. 13 крас. С. 3);

19) *тэле-* (< *тэлебачанне, тэлевізійны*): *тэлефельетаніст* ‘фельетаніст, які стварае фельетоны для тэлебачання’: *Ад такога прамога і рэзкага Азаронка да іранічнага* ***тэлефельетаніста*** *Андрэя Мукавозчыка* (Звязда. 2023. 25 лют. С. 11);

20) *фарм-* (< *фармацэўтычны*): *фармлідар* ‘лідар па выпуску фармацэўтычнай прадукцыі’: *...Пастаянна павялічваецца інтэнсіўнасць кантактаў з калегамі з Індыі, прычым сусветнымі* ***фармлідарамі*** (Звязда. 2024. 9 сак. С. 3); *фармсубстанцыя* ‘лекавы сродак, прызначаны для вытворчасці, вырабу лекавых прэпаратаў і вызначэння іх эфектыўнасці’: *У ходзе дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы “Распрацоўка фармацэўтычных субстанцый, лекавых сродкаў і нарматыўна-прававога забеспячэння фармацэўтычнай галіны” распрацоўваюцца новыя як* ***фармсубстанцыі****, так і лекавыя сродкі, а таксама нарматыўная база па забеспячэнні вытворчасці гэтых прэпаратаў і рэчываў* (Звязда. 2024. 09 сак. С. 3);

21) *хім-* (< *хімічны*): *хімапрацоўка* ‘прымяненне хімічных рэчываў для знішчэння шкодных насякомых і грызуноў’, *хімпраполка* ‘знішчэнне пустазелля гербіцыдамі ў пасевах і пасадках культурных раслін’: *Апрацоўваем палеткі, уносім угнаенні, займаемся* ***хімпраполкай****,* ***хімапрацоўкай*** *сельгаскультур* (Звязда. 2023. 25 лют. С. 6);

22) *эка-* (< *экалагічны*): *экадобраахвотнік* ‘добраахвотнік, які займаецца экалагічнымі праблемамі’: *Узброіўшыся наборам удзельнікі чэмпіянату (у яго ўваходзяць бэйдж, пакеты для збору розных відаў смецця – шкла, металу, пластыку, паперы, пальчаткі), каманды* ***экадобраахвотнікаў*** *зоймуцца зборам смецця на хуткасць* (Чырвоная змена. 2023. 26 ліст. С. 7); *эказемляробства* ‘земляробства, заснаванае на выкарыстанні арганічных угнаенняў, а таксама севазвароту і спадарожных пасадак’: *А вось на выкарыстанне хімікатаў у* ***эказемляробстве*** *накладзена жорсткае табу* (Звязда. 2023. 13 крас. С. 16); *экамерапрыемства* ‘мерапрыемства, на якім абмяркоўваюцца або вырашаюцца экалагічныя праблемы’: *Першае* ***экамерапрыемства*** *чэмпіянату аб’яднала каманды мінскіх устаноў вышэйшай адукацыі – 25 каманд, 75 чалавек* (Чырвоная змена. 2023. 26 ліст. С. 7); *экапарк* ‘прыродны аб’ект з распрацаванымі экалагічнымі маршрутамі’: *Па даразе ў Станькава, дзе і* ***экапарк****, і графская сядзіба, заехаць у Літавец – лясную спаленую фашыстамі вёску…* (Звязда. 2023. 24 лют. С. 13);

23) *электра-* (< электрычны): *электрадом* ‘дом з электрычным ацяпленнем’: *Новым месцам жыхарства маладых спецыялістаў цяпер будзе сучасны* ***электрадом*** (Настаўніцкая газета. 2023. 10 лют. С. 6); *электралодачка* ‘лодачка з электрычным рухавіком’: *У парку Горкага плануюць устанавіць басейн з* ***электралодачкамі*** *і 5D-атракцыён* (Звязда. 2023. 4 мая. С. 7); *электрасамакат* ‘самакат, які працуе на электрычнай энергіі’: *Усім ахвотным 22 верасня дадуць зніжку на арэнду шэрынгавых веласіпедаў і* ***электрасамакатаў*** *па промакодзе “Без аўто”* (Звязда. 2022. 17 верас. с. 3); *электрасмецце* ‘адпрацаваныя элементы сілкавання (акумулятары і батарэйкі)’:

МГПУ им. И.П. Шамякина

*“**Электрасмецце**” ад мабільніка, ноўтбука, аўтамабіля* (загаловак артыкула) (Звязда. 2024. 12 студз. С. 1);

24) *эпід-* (< эпідэміялагічны, эпідэмічны): *эпідсезон* ‘перыяд захворванняў на якую-небудзь інфекцыю (рэспіраторныя вірусы, клешчавыя інфекцыі і інш.)’: *А іх істотны ўздым у сёлетнім **эпідсезоне** чакаецца зімой – са студзеня да сакавіка з пікам у лютым* (Звязда. 2023. 21 верас. С. 1);

25) *этна-* (< этнаграфічны): *этна-вечарына ‘вечарына, прысвечаная нацыянальнай культуры*’: *Удзельнікі **этна-вечарыны** “Вішнёвага фестывалю” ў Глыбокім прадэманстравалі сваю нацыянальную культуру і пазнаёміліся з беларускімі традыцыямі* (Літаратура і мастацтва. 2023. 28 ліп. С. 3).

Як паказвае аналіз разгледжаных складанаскарочаных неалагізмаў, яны валодаюць разгалінаванай сістэмай словаўтваральных тыпаў. Іх словаўтваральная структура вельмі празрыстая і лёгка ўзнаўляецца, але семантыка патрабуе разгорнутага тлумачэння.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па дагаворы № 1410/2021.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Климович, С. М. Структурно-семантичні типи аброутворень в українській мові : дис. … канд. філол. наук : 10.02.01 / С.М. Климович ; Херсонський держ. ун-т. – Херсон, 2008. – 224 л.

## О ПРОСТРАНСТВЕННОЙ СЕМАНТИКЕ ПРЕДЛОГОВ *ИЗ-ЗА* И *ИЗ-ПОД*

**О.В. Толкачёва**
преподаватель кафедры иностранных языков и МПИЯ
УО «Мозырский государственный педагогический университет им. И.П. Шамякина»
(г. Мозырь, Республика Беларусь)

При помощи предлогов описывается положение физических объектов в пространстве (т. е. локализуемых объектов) относительно других (локализующих) объектов. Предлоги задают координаты расположения локализуемого объекта относительно локализующего по отношению к движению, топологическому (базируется на противопоставлении внутреннего и внешнего пространств) и дименсиональному (отражает ориентацию в пространстве тела человека по осям «сверху – снизу», «спереди – сзади», «слева – справа») измерениям. Признаки, отражающие названные измерения, характеризуют регион локализующего объекта, с которым соотносится локализуемый, и дистантные отношения (включение, исключение, контакт, близкое расположение) между обоими объектами [1]. Данные признаки входят в семантику всех подгрупп пространственных предлогов, имея в ней разный статус. В соответствии с доминирующим типом признаков их семантике и пространственные предлоги подразделяются на топологические, дименсиональные и дирекциональные [2, с. 56].

Семантика дирекциональных предлогов характеризуется рядом специфических признаков. Так, сема ДИРЕКЦИОНАЛ, в соответствии с тем, какую категоризацию приписывает предлог локализующему объекту, уточняется как ДИРЕКЦИОНАЛ$_{\text{ИСТОЧНИК}}$, ДИРЕКЦИОНАЛ$_{\text{ПУТЬ}}$, ДИРЕКЦИОНАЛ$_{\text{ЦЕЛЬ}}$ [2, с. 54]. Кроме этого, топологические признаки в семантике дирекциональных предлогов локализуются по шкале времени как существовавшие в прошлом (у предлогов с семой ДИРЕКЦИОНАЛ$_{\text{ИСТОЧНИК}}$), актуаль-

МГПУ им. И.П. Шамякина